# Класная гадзіна «Я і свет прафесій»

**Г. І. Галавенка**,
настаўнік рускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
Пескаўскага ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа

**Мэта:** паглыбленне ведаў навучэнцаў аб свеце прафесій і фарміраванне ў іх камунікатыўнай кампетэнтнасці.

**Задачы:**

- ✓ пашырыць веды вучняў аб розных прафесіях;
- ✓ узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў;
- ✓ развіваць уменне працаваць у камандзе;
- ✓ выхоўваць павагу да людзей розных прафесій.

**Форма правядзення:** інтэрактыўная гульня.

**Абсталяванне:** пазлы з выявамі розных прафесій, канверты з заданнямі, мультымедыйная прэзентацыя, падрыхтаваныя дома дзецьмі фатаграфіі і малюнкі, якія адлюстроўваюць прафесіі іх бацькоў, мяшок з прыладамі працы.

## Ход занятку

### I. Уступная частка

**Класны кіраўнік.** Уявіце сабе такую сітуацыю: усе людзі на планеце пакінулі сваю работу і сталі толькі адпачываць. Не працуюць вадзіцелі і будаўнікі, не выйшлі на работу лекары, дворнікі перасталі падмятаць вуліцы, настаўнікі не пайшлі ў школу. Усміхаецеся? Не працуючы, мы проста не зможам

выжыць. Чалавек павінен працаваць і рабіць сваю справу прафесійна. Мы сёння з вамі будзем гаварыць аб прафесіях.

На свеце вялізная колькасць прафесій. Каб работа прыносіла задавальненне, неабходна выбраць сабе занятак па душы. Сёння, гаворачы пра людзей розных прафесій, вы паспрабуеце вызначыць, чым бы вам хацелася займацца ў будучыні.

**II. Асноўная частка**

У каробцы на настаўніцкім стале ляжаць загадзя падрыхтаваныя настаўнікам пазлы з выявамі розных прафесій. Вучням прапаноўваецца іх скласці і раздзяліцца на каманды ў залежнасці ад малюнка, які атрымаўся.

✓ Апішыце, што адлюстравана на малюнку? *(Адказы вучняў.)*

✓ Што аб’ядноўвае ўсе гэтыя малюнкі? *(На іх прадстаўнікі пэўных прафесій.)*

✓ Назавіце вядомыя вам прафесіі. *(Адказы навучэнцаў.)*

■ **Гульня «Адгадай прафесію».** З пераблытаных літар, адлюстраваных на слайдзе, камандам неабходна скласці словы (назвы прафесій): ШКАВАЧ, ОВПРА, ЧУАР, АМКРА. Перамагае тая, якая хутчэй і правільней выканае заданне. *(Швачка, повар, урач, марак.)*

■ **Гульня «Чароўны мяшочак».** У мяшочку складзены пэўныя прылады працы. Прадстаўнікам ад каманд неабходна па чарзе выцягваць адтуль па адной рэчы і называць, прадстаўніку якой прафесіі яна належыць. За кожны правільны адказ каманда атрымлівае 1 бал. Калі хтосьці робіць памылку, то адказ дае каманда, прадстаўнік якой хутчэй падняў руку. Перамагае каманда, якая набярэ больш за ўсіх балаў.

| ***Прадмет*** | ***Прафесія*** |
|---|---|
| чарпак | повар |
| фанендаскоп | урач |
| указка | настаўнік |

| | |
|---|---|
| пэндзаль | мастак |
| мікрафон | спявак |
| малаток | сталяр |
| грэбень | цырульнік |

✓ Паглядзіце на слайд і скажыце, прадстаўнікам якой прафесіі належаць гэтыя прадметы? *(На слайдзе вагі, нівелір.)* Чым займаюцца гэтыя спецыялісты?

■ **Паведамленні навучэнцаў.** Дзеці чытаюць падрыхтаваныя дома паведамленні пра прафесіі сваіх бацькоў і дэманструюць фатаграфіі, малюнкі, якія іх адлюстроўваюць. На дошцы афармляецца фотакалаж «Прафесіі бацькоў».

✓ Як вы думаеце, чаму дзеці павінны ведаць аб прафесіях бацькоў? *(Разважанні дзяцей.)*

■ **Гумарыстычная віктарына.**

<u>Назавіце прафесіі:</u>

– самая зялёная (*садоўнік, ляснік, кветкавод-дэкаратар)*;

– самая салодкая *(пчаляр, кандытар, дэгустатар, прадавец у кандытарскім аддзеле)*;

– самая валасатая *(цырульнік)*;

– самая грашовая *(банкір, прафесійны спартсмен, праграміст*);

– самая дзіцячая *(выхавацель, памочнік выхавацеля, настаўнік)*;

– самая адказная *(суддзя, пракурор, хірург*);

– самая смешная *(клоун, парадыст)*;

– самая разумная *(навуковец, прафесар*);

– самая белая *(лекар*);

– самая зубастая *(стаматолаг)*;

– самая начытаная *(бібліятэкар, настаўнік языка і літаратуры)*;

– самая таварыская *(журналіст, экскурсавод, трэнер, настаўнік, масавік-забаўнік)*;

– самая сур'ёзная *(сапёр, хірург, выведнік, паліцэйскі, палітык).*

■ **Гульня «Хто ёсць хто».** Кожная каманда атрымлівае канверт з карткамі, дзе знаходзяцца назвы прафесій і прыводзіцца іх апісанне. Удзельнікам неабходна размясціць карткі парамі: назва прафесіі і яе апісанне. Перамагае тая, якая хутчэй і правільней выканае заданне.

**Заданне для першай каманды (састарэлыя прафесіі)**

| | |
|---|---|
| рымар | слуга ў доме спадароў, карчме, гасцініцы |
| бондар | прыдворны чын, арганізатар палявання |
| лакей | спецыяліст па коннай збруі |
| лоўчы | майстар, які вырабляе дзежы і іншыя рэчы с дрэва |

**Заданне для другой каманды (рэдкія прафесіі)**

| | |
|---|---|
| сурда-перакладчык | спецыяліст, які падтрымлівае ў добрым стане зялёныя газоны для гольфа, бейсбола, футбола |
| пасціжор | прафесійны дэгустатар чаю |
| тытэстар | чалавек, які прафесійна валодае мовай жэстаў, пры дапамозе якой адбываюцца зносіны з людзьмі, пазбаўленымі слыху |
| грынкіпер | вырабляе на заказ вусы, косы, бакенбарды, бароды, парыкі |

**Заданне для трэцяй каманды (новыя прафесіі)**

| | |
|---|---|
| рыэлтар | стваральнік рэкламных тэкстаў |
| дэкларант | спецыяліст па продажы нерухомасці |
| офіс-менеджар | спецыяліст па працы на мытні, які сочыць за афармленнем дакументацыі і рухам грузаў |
| капірайтар | чалавек, асноўнай задачай якога з'яўляецца забяспечанне працы офіса |

**Заданне для чацвёртай каманды (прафесіі будучага)**

| | |
|---|---|
| інжынер-кампазітчык | будзе распрацоўваць турыстычныя праграмы ў касмічную прастору, на міжпланетныя базы |
| урбаніст-эколаг | будзе праектаваць новыя экалагічначыстыя гарады |
| сіці-фермер | будзе вырошчваць садавіну і гародніну на дахах дамоў |

| | |
|---|---|
| менеджар косматурызму | будзе падбіраць кампазітныя матэрыялы для вытворчасці, у тым ліку з выкарыстаннем 3d-друку, робататэхнічных прылад з зададзенымі характарыстыкамі |

■ **Гульня «Пантаміма».** Вядучы раздае карткі, у якіх напісана прафесія. Прадстаўнікам каманд неабходна адлюстраваць яе пры дапамозе жэстаў і мімікі (без слоў). Каманда сапернікаў павінна адгадаць, якая прафесія дэманструецца.

*(Пілот, жанглёр, швачка, шафёр).* Перамагае тая, якая хутчэй адгадае паказаную прафесію.

■ **Гульня «Адгадай па апісанні».** У абмеркаванні ўдзельнічаюць усе члены каманды. Праз адну хвіліну капітан каманды павінен назваць апісаную ў заданні прафесію. Калі дадзены адказ з’яўляецца памылковым, каманда-сапернік мае права адказаць і зарабіць дадатковы бал. Перамагае каманда, якая правільна адгадае прафесію і набярэ больш за ўсіх балаў.

**1.** У лесе, у пустыні, у гарах, у гарадах і нават у моры цягнуцца лініі электраперадач. Яны прыносяць нам святло, цяпло і, галоўнае, электраэнергію. Правядзеннем прафілактычных і аварыйных работ на электрычным абсталяванні, падтрыманнем у парадку электрасетак, паветраных трас і кабельных ліній заняты прадстаўнікі гэтай прафесіі. Строгае выкананне правіл тэхнікі бяспекі – абавязковая ўмова гэтай прафесіі. *(Электраманцёр.)*

**2.** Да працаўнікоў гэтай прафесіі адносяцца словы М. В. Ламаносава: «У зямных нетрах прастора, і багата царствуе натура. Металы і мінералы самі ў двор не прыйдуць – патрабуюць вачэй і рук для свайго прыіску». Высокія медыцынскія патрабаванні прад’яўляюцца да людзей гэтай прафесіі, так як на працягу ўсёй працоўнай змены яны вымушаны знаходзіцца глыбока пад зямлёй. *(Гарняк, шахцёр.)*

**3.** У цяперашні час у Беларусі гэтая прафесія заваявала асаблівую папулярнасць. У адрозненне ад еўрапейскіх краін у нас атрымаць дадзеную прафесію зусім не складана, а вось у Францыі, напрыклад, той, хто прэтэндуе на гэтую вакансію, падвяргаецца сур'ёзнаму іспыту. Адным з галоўных этапаў экзамену з'яўляюцца псіхалагічныя выпрабаванні. Іх задача – усталяваць асабістыя якасці экзаменуемага: ступень актыўнасці, уменне захоўваць самавалоданне і стрыманасць. Кандыдаты пішуць абавязковае сачыненне аб сваёй будучай прафесіі, па якім экзаменатары судзяць аб разумовых здольнасцях экзаменуемага, узроўні яго духоўнай культуры. Падказка: прадстаўнік гэтай прафесіі мае справу з каштоўнасцямі і грашыма. *(Прадавец.)*

**4.** Людзі гэтай прафесіі першымі прыбываюць на месца злачынства, яны ўсе ведаюць пра адбіткі пальцаў і пра почырк чалавека. Любы спецыяліст гэтай прафесіі ведае, што ў мужчын даўжыня кроку 60-90 см, а ў жанчын і старых – 50-70 см, калі ж даўжыня кроку – метр і больш, значыць, чалавек бяжыць. *(Крыміналіст).*

Падвядзенне вынікаў і вызначэнне пераможцаў.

**III. Заключная частка. Рэфлексія.**

✓ Якая прафесія вам здалася самай незвычайнай?

✓ Якая здзівіла?

✓ А якую прафесію, на ваш погляд, можна назваць самай галоўнай?

✓ Хто з вас ведае, дзе трэба вучыцца, каб атрымаць прафесію настаўніка? *(Вучні адказваюць, настаўнік дапамагае, дапаўняе. Дэманструюцца слайды педагагічных вышэйшых устаноў).*

✓ Якімі якасцямі, на ваш погляд, павінен валодаць сучасны настаўнік?

✓ А якімі павінны быць вучні?

■ **Прыём «Плюс-мінус-цікава».** На дошцы пад літарай **П** (плюс) запісваецца ўсё, што спадабалася вучням на занятку, інфармацыя і формы работы, якія выклікалі станоўчыя эмоцыі, або, на думку навучэнца, могуць быць

яму карысныя для дасягнення якіх-небудзь мэтаў. Пад літатрай **М** (мінус) запісваецца ўсё, што не спадабалася на мерапрыемтве, здалося сумным і незразумелым, або інфармацыя, якая, на думку навучэнца, была для яго непатрэбнай, бескарыснай з пункту гледжання рашэння жыццёвых сітуацый. Пад літарай **Ц** (цікава) вучні запісваюць усе цікавыя факты, пра якія даведаліся на занятку і пра якія яшчэ хацелі б даведацца.